УДК 811.161.3’373.4

# ВЕРБАЛЬНАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПЕДАГОГІКІ МАЛЕНСТВА Ў ПАРЭМІЙНЫХ МІКРАТЭКСТАХ (ЛІНГВАСЭНСАРНЫ АСПЕКТ)

**В.І. Марцынкевіч**
УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна” (г. Мазыр)

Дзеці – асобны аб’ект увагі з боку дарослых, бо з’яўляюцца патэнцыялам грамадства. Ва ўсе часы выхаванне дзяцей было і застаецца адказнай справай дарослых. Менавіта яны, дарослыя (а гэта не толькі бацькі), ажыццяўлялі сацыялізацыю дзяцей, паэтапнае далучэнне іх да народнай мудрасці.

Як вядома, прыкладамі народнай мудрасці з’яўляюцца прыказкі і прымаўкі. Яны здаўна прыцягвалі ўвагу навукоўцаў розных школ і напрамкаў, таму гэтыя жанры вывучаны даволі грунтоўна (Я.Я. Іваноў, Ю.А. Петрушэўская, В.В. Ламакіна, І.Я. Лепешаў, А.С. Дзядова, А.Л. Садоўская, С.Ф. Іванова**,** Н.Б. Мячкоўская). Аднак актуальнасць звароту да тэмы даследавання абумоўлена нераспрацаванасцю сэнсорыкі мікратэксту парэмій.

Вызначым метадалагічныя параметры фрагмента даследавання. Аб’ектам нашай увагі ў прапанаваным артыкуле з’яўляюцца прыказкі і прымаўкі пра маленства. Прадмет даследавання – адлюстраванне ўзроставага перыяду маленства праз выхаваўчыя аспекты беларускай народнай педагогікі. Мэта – вербалізацыя сэнсорыкі парэмійных мікратэкстаў з пазіцыяніраваннем маленства. Дасягненню пастаўленай мэты садзейнічае рашэнне наступных задач: на матэрыяле беларускіх прыказак і прымавак выявіць лексічныя адзінкі рэпрэзентацыі пяці сэнсарных каналаў успрымання (зрок, слых, тактыльнасць, смак, пах); вызначыць моўныя сродкі выражэння сэнсарнай лексікі.

Апісальны метад з’яўляецца асноўным у даследаванні і рэалізуецца ў прыёмах інтэрпрэтацыі і сістэматызацыі матэрыялу, таксама выкарыстаны прыёмы дэфініцыйнага і кантэкстуальнага аналізу. Фактычны матэрыял сабраны спосабам суцэльнай выбаркі са зборнікаў і слоўнікаў беларускіх народных прыказак, прымавак, фразем і крылатых выслоўяў.

Існуе неадназначнасць падыходаў у вызначэнні паняццяў “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”. Па меркаванні В.С. Болбаса [1, с. 25], больш дакладнай уяўляецца трактоўка прафесара Г.П. Арловай, якая вызначае народную педагогіку як “сукупнасць і ўзаемазалежнасць уяўленняў, поглядаў, меркаванняў, перакананняў, ідэй, навыкаў і прыёмаў народа ў галіне выхавання, адлюстраваных у народнай творчасці” [2, с. 7].

Этнапедагогіка – галіна навуковых даследаванняў, што займаецца вывучэннем народных выхаваўчых традыцый, асаблівасцямі сацыялізацыі асобы ў традыцыйных культурах народаў свету. Такая трактоўка стасуецца

МГПУ им. И.П. Шамякина

з пазіцыяй, калі этнапедагогіка разумеецца як напрамак у даследаванні сацыялізацыі і адукацыі [3, с. 329].

У межах нашага даследавання мы будзем абапірацца на этнапедагагічны падыход (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, Л.В. Ракава), які ўлічвае прыналежнасць дзіцяці да пэўнага этнасу і ажыццяўленне арганізацыі выхавання на аснове нацыянальнай культуры [1, с. 24].

У манаграфіі прафесара Г.П. Арловай "Беларуская народная педагогіка" (Мінск, 1993), дзе даследуецца педагогіка маленства, дзяцінства і юнацтва, маленства вызначаецца як узроставы перыяд ад нараджэння дзіцяці да 6–8 гадоў. Паводле этнаграфічнага даследавання Л.В. Ракавай "Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы" (Мінск, 2000) дзяцей ад нараджэння да 2–3 гадоў называлі "анёлкі" (дзіця незаплямленае грахом як "чыстая дошка" ("tabula rasa")). У беларускай этнаграфіі гэты ўзрост матывавана называецца сысункоўства, калі асноўным спосабам харчавання дзіцяці з'яўляецца смактанне малака з грудзей маці. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы вызначае дэфініцыю *сысун* як 'дзіцяня млекакормячай жывёліны, якое ссе маці' (з паметай *разм. жарт.* маленькае дзіця; немаўля) [4, т. 5, кн. 1, с. 435].

Звяртаючыся да тэрміналагічнага апарату даследавання, адзначым, усдед за В.К. Харчанка, што "сэнсарная лінгвістыка вывучае мову перцэпцыі як сістэму вербальнай рэпрэзентацыі фізіялагічных паказчыкаў пяці органаў пачуццяў: зроку, слыху, тактыльнасці, смаку, паху" [5, с. 6]. Перцэпцыя – успрыманне, непасрэднае адлюстраванне аб'ектыўнай рэальнасці ў той момант, калі яна дзейнічае на нашы органы пачуццяў [4, т. 4, с. 244].

Лічым, што акрэсленая вышэй матывацыя сысункоўства выразна пазіцыяніруецца ў прыкладах ***Малако** на **губах** не **абсохла***; *Ласкавае цялятка дзве маткі* ***ссе**, а гордае – ні адной*, дзе эксплііцытна выражаны сэнсорыка смаку і сэнсорыка тактыльнасці. Так, успрыманне смаку малака ў працэсе смактання вербалізавана спалучэннем наймення прадукта харчавання (*малако*) + саматызма (*губы*), які непасрэдна ўдзельнічае ў працэсе спажывання ежы. А ўспрыманне тактыльнасці (праз дакрананне дзіцяці губамі да грудзей маці) вербалізавана дзеясловам *ссаць*.

Даследаванні А.В. Нагорнай дазваляюць нам "аднесці да датыкальнага слоўніка лексічныя адзінкі, якія абазначаюць адчуванні, звязаныя з наяўнасцю або адсутнасцю вільгаці на паверхні аб'екта" [6, с. 44]. Услед за А.В. Нагорнай, выкажам меркаванне, што ў аналізуемым кантэксце дзеяслоў *абсохнуць* з адмоўнай часціцай *не* абазначае наяўнасць вільгаці (*малака*) на паверхні губ.

Разам з тым, адзначым, што ў такім кантэкстуальным акружэнні можна гаварыць і пра імпліцытна выражаную **сэнсорыку паху**, калі ўспрыманне паху адбываецца праз смак малака на губах, а пах малака на ўзроўні падсвядомасці асацыіруецца ў немаўляці з пахам маці. Такім чынам, фізічны кантакт маці і дзіцяці адбываўся праз кармленне грудным малаком.



МГПУ им. И.П. Шамякина

У народнай педагогіцы асобна выдзяляюць педагогіку маленства, так званую “школу пешчання”. Да самых маленькіх дзяцей бацькі адносіліся асабліва ўважліва і пяшчотна. Іх ахутвалі любоўю і ласкай, імкнуліся, каб дзіця менш плакала. Параўнаем: *Першае дзіцятка –* ***панятка; Песцяць*** *(дзіця), як першае ды апошняе;* ***Трасецца*** *над дзіцем;* ***Носіцца****, як курыца з яйкам.*

“Школу пешчання” яшчэ называюць “матчынай школай”, асабліва падкрэсліваючы выключную ролю маці, для якой выхаванне сваіх дзяцей з’яўляецца свяшчэнным абавязкам. Так, у прыкладах выразна гучыць матчыў любові і цеплыні да дзяцей: *У каго мамка, у таго галоўка* ***гладка;*** *Сваё дзіцятка* ***міла****; Кожнаму сваё дзіця* ***любае;*** *У маткі* ***няма розніцы*** *для дзіцяткі; Кожная матка* ***не вораг*** *свайму дзіцятку; І ваўчыха сваіх дзяцей* ***любіць****; Ваўчыха й тая сваё дзіця* ***беражэ*** (у дадзеным кантэксце зоамарфізм *ваўчыха* выступае ўвасабленнем маральных якасцей асобы маці).

У маленстве маці абавязкова спявала калыханкі, і праз голас маці немаўля на слых успрымала акаляючы свет. Так адбываўся слыхавы кантакт маці і дзіцяці, што дае падставы для вызначэння **сэнсорыкі слыху.** Параўнаем: ***А-а-а,*** *малое, пакуль будзе другое****, а-а-а,*** *Несцерка, пакуль будзе шэсцерка*; ***Люлі, люлі, люлі*** *палез кот у дулі*. Пад час забаўлянак ажыццяўляўся тактыльны кантакт праз пяшчотныя дакрананні (**сэнсорыка тактыльнасці**) маці да ручак і ножак дзіцяці: ***Лады, лады, ладкі*** *паедзем да бабкі;* ***Кую, кую*** *ножку, паеду ў дарожку.* Як сведчаць прыклады, у парэмійных мікратэкстах слыхавое ўспрыманне выражаецца гукаперайманнем і выклічнікамі. Эмацыянальны кантакт адбываўся праз ласкавыя моўныя звароты маці да свайго дзіцяці: *Адзін* ***сынок*** *Юзік і той –* ***як гарбузік; Кірпачка*** *мая* ***маленькая, дарагенькая****.* Мяркуем, што ў дадзеным фрагменце даследавання дэмінутыўныя суфіксы -*ок, -ік, -еньк, -юсеньк* выступаюць своеасаблівымі **сэнсарнымі маркёрамі** малога ўзросту.

Як адзначаюць даследчыкі, на першым годзе жыцця немаўляці галоўнай задачай для маці з’яўлялася фарміраванне нервовай сістэмы дзіцяці, што было вельмі важна для далейшага фарміравання маральнага здароўя [7, с. 7].

Адзначым, што працэс выхавання ажыццяўляўся ў залежнасці ад узросту і псіхалагічных асаблівасцей выхаванца, што ілюструе прыклад: *Якія* ***гады****, такі і* ***розум****.* Так, у парэміях дзіця ва ўзросце да 7 гадоў характарызуецца як несвядомае і неразумнае: *Да* ***году*** *дзіця –* ***як яечка,*** *да* ***трох*** *–* ***як авечка****; Да* ***пяці*** *год* ***пястуй*** *дзіця, як яечка, да* ***сямі пасі****, як авечку, то выйдзе на чалавечка,* таму што *Чалавек* ***да сямі*** *лет* ***праўду*** *гаворыць.*

З узростам адносіны да дзяцей становяцца ўсё больш строгімі і патрабавальнымі. І разам з тым, “народ-педагог” [7, с. 9] падкрэслівае, што дзяцей трэба выхоўваць у строгасці з самага маленства: *Тады дзяцей вучаць, як* ***каля лаўкі*** *ходзяць; Выхоўвай дзіця, як* ***упоперак ложка*** *ляжыць.* У дадзеным кантэксце зрокавае ўспрыманне маленства выражана лакулятыўным спалу-



МГПУ им. И.П. Шамякина

чэннем назоўніка (*лаўка, ложак*) з прыназоўнікам пpaстopавага значэння (*каля, упоперак*).

Нягледзячы на існаванне своеасаблівай “школы пешчання” адносна самых маленькіх дзетак, народная мудрасць перасцерагае бацькоў ад празмернай апекі над дзецьмі, каб прадухіліць магчымасць распеставаць дзіця: *Малому* ***не патурай****, а што трэба дай;* ***Годзе*** *яму* ***патураць****, бо вырасце злодзеем; Лепш даглядзі, а* ***за руку не вадзі; Выпесціць пестуна****; З* ***пестуна*** *нічога не будзе; Выхавай дзяціну на* ***ліхую*** *гадзіну.*

У гэтай сувязі парэміялагічныя адзінкі можна разглядаць і як своеасаблівыя інструкцыі для бацькоў па пытаннях выхавання: *Дзяцей гадаваць – волі* ***не даваць****.* ***Дасі*** *дзецям волю –* ***адбярэш*** *долю* (адзначана ўжыванне семантычнай апазіцыі дзеясловаў тактыльнасць *даваць – адбіраць*).

Вынікі праведзенага фрагмента даследавання дазваляюць сцвярджаць, што маленства – гэта першы ўзроставы перыяд жыцця новaнароджанага дзіцяці (найменні *анёлак, сысунок, немаўля*). У адпаведнасці з традыцыямі і народнымі поглядамі на гэтай узроставай ступені вызначальнымі сродкамі выхавання выступаюць ласка і пяшчота, голас і дакрананне, дапускаецца таксама строгасць і патрабавальнасць.

Сэнсарныя маркёры перыяду маленства рэпрэзентуюць лексіку смаку, слыху, тактыльнасці, зроку.

Табліца 1 – Сэнсарныя маркёры перыяду маленства

| | **Сэнсарны канал** | **Моўныя Сродкі** | **Прыклады** |
|---|---|---|---|
| 1. | **Смак** | Найменне прадукта харчавання<br>Саматызм<br>Дзеясловы тактыльнасці | Малако<br>Губы<br>Абсохнуць |
| 2. | **Слых** | Лексіка калыханкі<br>Гукаперайманне | Люлі, люлі, люлі<br>А-а-а |
| 3. | **Тактыльнасць** | Лексіка забаўлянкі | Кую, кую<br>Лады, лады, ладкі |
| | | Дзеясловы пешчання | Песціць (выпесціць),<br>трэсціся, насіцца, пасціць |
| | | Дзеясловы тактыльнасці | Даваць – адбіраць |
| | | Параўнальны зварот | Панятка, бы ягнята,<br>як яечка, як авечка |
| 4. | **Зрок**<br>Месца | Лакулятыўнае спалучэнне<br>(прыназоўнік + назоўнік) | Каля лаўкі (*ходзіць*)<br>Упоперак ложка (*ляжыць*) |
| | Узрост | Дэмінутыўныя суфіксы | Дзіц*ятк*а, мал*еньк*і |
| | знешнасць | | Кірп*ачк*а, як гарбуз*ік* |
| **Эмацыянальнасць** | | | |

Падсумоўваючы вышэйсказанае, адзначым, што народная мудрасць – гэта практычны вопыт, правераны часам, таму ва ўсе часы (і сучаснасць не выключэнне) застаецца актуальным змест павучання: *Вучы народ,* ***вучыся ў народа****.*



МГПУ им. И. П. Шамякина

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Болбас, В.С. Народная педагогіка Мазырскага Палесся / В. С. Болбас, І.С. Сычова. — Мазыр : Белы Вецер, 2012. – 246 с.

2. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск : Нар. асвета, 1993. – 120 с.

3. Педагогический энциклопедический словарь / гл. ред. Б.М. БимБад ; редкол. : М.М. Безруких [и др.]. – М. : Большая Рос. энцикл., 2008. – 528 с.

4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад рэд. К. Крапівы. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.

5. Харченко, В.К. Лингвосенсорика: фундаментальные и прикладные аспекты / В.К. Харченко. – М. : Либроком, 2012. – 216 с.

7. Нагорная, А.В. Лингвосенсорика как перспективное направление современных лингвистических исследований: аналит. обзор / РАН. ИНИОН. Центр гуманит. науч.-информ. исслед. отдел языкознания ; отв. ред. Е.Б. Яковлева. – М., 2017. – 86 с.

8. Развитие образования, школы и педагогики в Беларуси в период XIX – начала XXI века : монография / А.П. Орлова [и др.]; под ред. А.П. Орловой. – Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2013. – 331с.

УДК 811.161.1`42:821.161.1-1

# ОБРАЗНЫЕ СРЕДСТВА РЕПРЕЗЕНТАЦИИ КАТЕГОРИИ ХРОНОТОПА В СТИХОТВОРЕНИИ В. МАЯКОВСКОГО «НОЧЬ»

**Е.С. Николаенко**
УО «Мозырский государственный педагогический университет
имени И. П. Шамякина» (г. Мозырь)

Проблема тропеизации категории хронотопа в текстах русских поэтов остается малоисследованной. Художественные тропы являются одним из важнейших средств выражения образного смысла произведения и нередко выполняют функцию текстообразования. С их помощью передается глубокое текстовое содержание.

Взаимосмозвязь пространственно-временныых отношений нашла отражение в работах таких исследователей, как М.М. Бахтин, А.Б. Темирболат, Р.И. Енукидзе, Л.В. Казанцева и др. В данной статье тропеизация рассматривается как форма развертывания хронотопического смысла текста.

Для выявления отличительных черт репрезентации категорий пространства и времени обратимся к лирическому произведению В. Маяковского «Ночь». Цель статьи – раскрыть специфику тропеизации категории хронотопа в стихотвореннии В. Маяковского «Ночь».

Рассмотрим случаи, когда художественные тропы выступают как средство образной репрезентации пространственной или временно́й категории.

1. Категория времени репрезентируется через эпитеты-колоративы *багровый* и *белый*. Эпитет *багровый* поэт употребляет как характеристику

МГПУ им. И. П. Шамякина